БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

...рэс: Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29. Адміністрацыі Захароуская «Юбілейны Дом».

...дакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
...міністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

...дакцыя пакідае за сабой права па... ...уляць перэсыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб. на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 97. Менск. Нядзеля 18 жніўня 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

Лекарскі аддзел Менскай Меськай Рады даводзіць да ...эама усіх, што у меськай лабараторыі пры Цэнтральнай ...булаторыі на Юрэускай вул. д. № 13 прыймаюцца ад ...іватных асобау і установау для аналізы усе харчовыя ...дукты, тэхнічныя і аптэкарскія, як сахарына, морфій, ко...н, і г. д. за умяркаваную плату.

Член Рады **В. Цывінскі.**
Сэкрэтар (подпіс)
Дзелавод (подпіс)

...прычыны сьвята Сьв. Спаса ...одны нумэр «Бел. Шляху» ...дзе у сераду, 21-го жніуня.

Менск 18/VIII.

Новы хлеб—адраджэньне.

...еларусь—гэта страна зем...обау. Стары гаспадарскі ...быу цяжкі. Раскладываю... ...расійская армія ні мела ...возу і усю зіму кармілася ...рускімі харчамі, большэ...кія «камісары» і «тавары...» зьнічтожылі запасы у два... і дворкох. Двары дапалі ...у у торговы абарот, і та...і спосабам хлеба ні стало. ...цейшыя селяне мелі трохі ...я, але ім ні было гаспа...кай патрэбы працаваць, і ...дзерлі спекулянтскія цэ... Васной бяднейшыя селяне, ...ныя ад 1 да 5 дзесяцін. ...рыя купілі даўней хлеб ...абодных для гандлю хлеб...ы запасоу у дворах, гала... вясной, елі толькі шчаве. ...ер усе мукі і сьляды боль...эцкай рэвалюцыі кончылі... ...людзі дачакаліся новага ...н. Беларусь, як край ска...цыны, купляла з Украіны і ...ларускіх чорназемных гу...рні 20 міл. пудоу хлеба, ...га гадавы хлебны баланс ...у парадку. Калі ні бу...эгаго падвозу, усе такі ...о хлеба на увесь год ні ...ць. Па весках народ па...сеу і падабрэу, звозячы ...ан у гумны.

...ікае і вечна новае за...ценне аратая дастаушаго ...у поце чэла свайго». ...тварэния вынесціу дух ...ання.

Дiфэрэнцыяцыя вескі.

В...на памагла пераходу ...у творчыя клясы: зем...у, гандляроу, фабрыкантоу і у нікаторыя катэгорыі труда. «Пасьля вайны»,—кажуць беларусы,—«будзе двое: адзін багаты, а другі бедны». Дiфэрэнцыяцыя і у весках зрабілася вялікая.

Селяне малазямельныя, каторых гаспадарка без заработку на старане ні магла пракарміць, пакуль мелі заработак пры вайне жылі добра, але вясной яны зьелі сваі запасы грошай. Трэба лічыць, што заработкау ад промыслу і гандлю доуга ні будзе, іх палажэнне ні палепшыцца.

Многазямельныя селяне, каторыя маглі прадаваць лішнія харчы і апрыч таго зараблялі працай, моцна пабагацелі. Нагул можна сказаць, што селянство пабагацело. Гэта вельмі шчаслівае зьявішчо. У аднэй воласьці да вайны было у зьберэгацельной кассе 54 тысячы, год таму пазад ужо было 840.000 р., апрыч таго пару сот тысяч палажылі некаторыя у Менску.

Відзімых грошай блізка мільёна, нівідзімых на руках так сама можэ быць палавіна мільёна.

Калі навад лічыць рубель папяровы за 10 к. золотам, то золотам капітал воласьці з 54 тысяч вырас у 150—200 тысяч. Селяне гэтыя грошы пасуюць на куплю зямлі, на мертвы інвентар, бо жывы інвентар хаця і паменьшыуся у 3 разы, але купіць яго німа гдзе. Цэны на зямлю растуць. Калі вайна кончыцца і упарадкаюцца фінансы, можна чакаць вялізнай мобілізацыі зямлі.

Цяпер трэба рабіць старанне, каб залажыць Беларускі зямельны банк для правідловаго разрубу зямлі, і закрыцця зямельнай спэкуляцыі.

А. Уласоу.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН 13 гм. «Вольф». «Voss. Ztg.» даносіць, што французы акрутным спосабам абходзяцца у Македоніі з рускімі, якія пасьля Берасьцейскаго міру адмовіліся далей ваяваць. Падлегае гэтаму абхаджэнню 7 полк рускай пяхоты у якім лічыцца, як відаць с протэсту знойдзенаго у двух дэзэртыраў, з 1200 салдатоў.

Пратэст гэты канчаецца слоўмі:

Народы і урады! Памажыця нам і абвесьціце усяму сьвету што нявінна церпім французкае тыранство.

Протэст падпісаны поўнамоцнікамі салдатоў 1-го батальёну.

БЭРЛІН, 13 гм. «Вольф». «Hufvudsqlaglaelet» ад 10 гм. паведамляе, што надзвычайны фінскі сойм, якога заданием будзя аканчацельны выбар караля, зьбярэцца 27 гм.

Фінляндскі урад арганізуе цяпер консулаты у Кіеві і Адэсі. Поўнамочнік на Украіну ужо выехаў с Фінляндзіі.

У Рэполя і Карэліі вялікія народныя зборы пастанавілі аб прылучэнні да Фінляндзіі. Да Фінляндскаго ураду выпраўляецца дэпутацыя. Пастанова аб прылучэнні прынята аднаголосна. Фінскі тоннаж рэквізаваны Нямеччынай цяпер зьвернуты зноў Фінляндзіі.

Брама да нова-го жыцця.

Адчынена брама у нашае новае жыццё. На вялікі кліч да працы ідзець усё болей і болей людзей. Адзін аднаго кліча:—Хадземо, браты, хадземо! Гэто наш доўг, гэто наш сьвяты абавязак. Мы адмовіцца ні можам. Ніхай вас ні пужае і ніудача, якая часам загародзіць дарогу,—шчырасьць, ахвота і правата нашай справы усё перамогуць.

Ідуць людзі да нашай брамы беларускай з усіх старон —з вёсак, з мястэчак, з мест, жывучыя у роднай зямельцы і тыя з іх, якія лёс закінуў на чужыню. Ідуць людзі розных станаў, розных клясаў, займаючыя розныя становішчы у грамадзянскім жыцці—селяне, рабочыя, вялікія землеўласьнікі, вучыцелі, дохтары, аграномы, адвакаты, інжэнэры і г. д.

Брама нашая расшыраецца, захопліваючы усё большыя і большыя грамады людзей. Нават частка з нашых быўшых праціўнікаў, якая часам шкодзіла беларускай справе і то цяпер захопліваецца і пачала верыць у сілу беларускаго адраджэння.

Адразу адпадаюць раней шыя упікі і іранічныя пытанні: Дзе ваша гісторыя? дзе ваша мова? дзе вашыя школы? дзе ваша літэратура? дзе ваш тэатр? дзе вашыя здабыткі старых гадоў?

На усе цяпер ёсьць адповедзі.

Гісторыя нашаго народу, выціснутая вялікарускім урадам з грубай тэндэнцыяй зьнішчэння усяго беларускаго з усіх школ, цяпер выходзіць наверх «як моцны рэактыў». За нашай гісторыяй стаіць і чэкае прыняцця новых форм адноўленнаго жыцця ўвесь жывы 10 мільёнвы беларускі народ. І мова аказалася, і літэратура знайшлася, і беларускі бадай сталы тэатр з досіць нібедным рэпэртуарам, і беларускае штукарство. Да двух сот беларускіх школ істнуюць ужо на нашай зямлі, некольні сярэдніх школ, а у хуткім часе унівэрсытэт так сама будзе.

Абы толькі шчырае жаданне да працы і у нас будзе усё уладжана ні горей, як у другіх народаў.

Ні было у нас граматыкі—адразу некольні аказалася.

Ні было слоўніка—адразу і некалькі ёсьць. Са школьнымі падручнікамі тое самае.

Жыццё бярэ заўсёды верх. Цэлы народ ні можа быць сьцёртым с твару зямлі, як бы яго у працяг соткаў гадоў ні стараліся зьнішчыць.

Усё шырэй і шырэй адчыняецца наша беларуская брама. Грамады людзей будуюць будоўлю нашаго нацыянальнаго і грамадзко-культурнаго добрабыту на доўгія гады, ні гледзючы ні на якія перашкоды.

З. Янкоускі.

„Што рабіць, што рабіць!?“

— Усе школы на Беларусі—беларускія.

— Увесь народ на Беларусі усьвядомлены нацыянальна.

— Грамадзкае жыццё на Беларусі, а асабліво сярод беларусаў у найлепшым стане.

— Эканамічныя сілы Беларусі выкарыстоўваюцца у найлепшай меры і згодна з досьледам найлепшай усесьветнай практыкі.

— Німа духоўнай цемнаты.

— Німа безграматных.

— Німа бедных.

— Німа ні да чаго ні прыпрэжаных сілаў.

Адным словам на Беларусі:

— Адукацыя квітнеіць.

— Экономіка развіваецца.

— Край узбагачаецца.

— Культура мацнеіць.

— Цывілізацыя ідзе на перад.

Дарагі мой чытачу! Хай ні падумаеш толькі ты, што я займаюся падшуканствам—барані мяне Бог!

Я добра ведаю, што і ты гэто ведаеш, што ні гэгу-усенька у нас німа. Што школы іщчэ трэба рабіць, экономіку ствараць, край узбагачаць, культуру паднімаць і што тагды толькі нашая цывілізацыя скранецца з мейсца.

А калі выжэй і выпісаў я гэныя ніпраўды, барджэй падобныя да глупстваў, то адно для таго толькі, каб лепі ты спаміў трагічныя запытання нікаторых асоб з нашаго грамадзянства:

— «Што рабіць? Скажэця, што рабіць?»

Здаецца, дапусьці ты яго да нейкай працы, дык ён та-

бе горы праз дзень пераварочае, хаця-б гэто былі Карпаты якія небудзь ці Альпы.

Па праўдзі-ж—ні вер яму чытачу. Хто пытаецца што рабіць у вобэц такой ніэлічанай працы, той па просту грамадзянскі підамуга, скончаны чалавек, хадзячы мерцвяк і ні варта траціць словы на яго навучанне, бо адыйшоўшы ад цябе спаткае іншэ кагось і да таго прычэпіцца, як і да цябе з сваім: «што рабіць?»

Гэто тэорытык працы, спэцыяльнасьцю якога—трагічнае гультайство.

Але натрапіўшы на такога з іх, катораго, падумаеш, варта пашкадаваць скажы яму чытачу:

— «Найперш трэба пакінуць гультайство. Потым трэба любіць сваю Бацькаўшчыну. Потым узяцца да споўнення сваіх абавязкаў. Ідзі і рабі тое, да чаго цябе вучылі. І помні заўсёды, што ты робіш гэто дзеля Бацькаўшчыны. А таму—рабі добра».

І каб ты, чытачу, аказаўся шчасьлівейшым за мене і усе гэтыя амаль што ні Гамлеты пад тваім уплывам зракліся свайго гультайскаго трагізму — на сколькі скарэй споўнілося-б тоя, аб чым мы с табой думаем.

Есьць іншэ адзін гатунак людзей у нашым грамадзянстві:

Іду я підаўно па вуліцы. Спатыкаю знаёмаго. Некалі разам вучыліся. Цяпер ён... Ну што аб гэтым казаць—далей відаць будзе што ён.

Затрымоўвае мяне. Хоча аб нечым распытацца. Слухаю.

— «Вы, як мне здаецца, бліжэй чым я да Рады?».

— То ест...

— Ну, бо вы і у газэці...

— Хай так, кажу, «Дык што?»

— Дык ці думае Рада аб чым небудзь?

— Пэўне-ж думае, калі яна Рада, адказую, як-жа так ні думаць?

— А што яна робіць?

— Мусіць і робіць тоя, што лічыць патрэбным.

— Слухайце, ні можна ж так! Рада павінна усе ведаць. Рада павінна аб усім думаць і усё прэдбачаць. Мяне гэто усё цікавіць як беларуса, (а уся гутарка па найпякнейшым расійскім дыалекці!) І хаця я нічога ні раблю, бо ні задзажаюся с тымі беларускімі партыямі...

-- Выбачайце дружэ, што вас пераб'ю. Ні маю часу. Усе беларускія партыі належаць да аднэй партыі, катора любіць свой народ і край—любіць Бацькаўшчыну і робіць усё подлуг свайго разумення і сілаў. А калі вы ні згаджаецеся з беларускімі партыямі, то значыць вам апрача «тургенеўскаго» дыалекту, на якім вы так покна «паясняетесь» нічога ні трэба. І... давідзэння, бо мне з вамі ні па аднэй дарозе,

Раю і табе, чытачу, гэткім способам канчаць падобныя споведзі. Ні марнуй часу. Ні кідай бісеру...

А. Навадворскі.

Жыды на Беларусі.

(Бытавыя штрыхі).

I.

Некалькі сталецьцяў таму назад, жыды перэбраліся у наш край праз заходнюю Эўропу і Польшчу. Да заняцця нашаго краю Расіяй яны апрача волі гандлю, рамёслаў і жыхарства усюды і на вёсках, мелі іншэ і сваё самаупраўленне — «кагал».

Зацішнейшыя рэпрэсіі над імі у нашым краю расійскім урадам былі поўзяты каля 1820 г., хаця ужо зараз жа пасьля «брацкаго» прылучэння Беларусі да Масквы, што сталося з апошнім раздзелам Польшчы у 1795 годзе, Беларусі надавалася роля жыдоўскаго «гетто». Перашкаджаючы усякімі способамі разсяленню жыдоўскаго элеманту у карэнных расійскіх губ. за «шкадлівасьць», расійскі урад, лічыўшы Беларускі край чужым забраным, паволі стварыў тут астрог для жыдоўскай людпасьці, уключыўшы Беларусь у ганебнейшую у гісторыі царскай Расіі, прагрымеўшую на увесь сьвет, так званую «черту еврейской осѣдлости».

Тут, па Беларусі, болей чым у сумежных краёх жыдоўскаго гетто, тварыўся іх эканамічны і культурно - нацыянальны быт доўгімі гадамі.

Зразумело, што гэтая творчасьць ні магла ні рабіць уплыву на характэр краю, як і сама яна павінна была пераняць нікаторыя яго асобнасьці, праз што тварыўся натуральны абмен культурнымі вартасьцямі паміж жыдамі і беларусамі.-

Суседзтво гэтых двух нацыяў тварыло такія жыццёвыя умовы і эконамічныя стасункі, у якіх адна нацыя без другой ні магла абыйсьціся.

Гандэль і рамёслы у нашым краю развівалі жыды. І трэба сказаць, што у гэтым кірунку яны дасіць ажывілі наш край і праз увесь час прыносілі яму шмат карысьці. Паміж іншым, яны тут частычна займаліся і хлебаробствам. З усіх губэрняў Эўропэйскай Расіі, толькі у нашых беларускіх губэрнях былі жыды—селяне, і да гэтаго часу інчэ захаваліся вёскі задным жыдоўскім насяленнем.

Месты і мястэчкі, у якіх салідную перавагу мело жыдоўское насяленне, давалі беларускім селянам мажлівасьць нармальнаго тавараабмену. Гандляры і рамёсьнікі так-сама былі ніабхадзімы у гэтым глухім (у бытнасьці пад Расіяй) краю, дзе ні было ніякай эконамічнай культуры.

Кавалі, шаўцы, краўцы былі людзі першай важнасьці і папапы у вёсках. Да іх прыхадзілі, у свой час, ні толькі па справах іх спэцыяльнасьці, але так сабе «пагутарыць з разумнымі людзьмі», параіцца аб розных справах і г. д.

Прыпісываць толькі адным жыдом спэцыяльнасьць гандлёваго шахармахарства і упаівання народа гарэлкай—нельга: мы добра ведаем, як у вялікарасійскіх губэрнях славянскія «купцы-кулакі» і «цѣловальники» эксплоатовалі тамтэйшых селян у некалькі стопняў болей, чым тут жыдоўскі гандлевы кляс нашых селян.

Ні гледзючы на цкавання рознымі чорнасопеннамі в Масковіі нашых селян на жыдоў,—наш народ нічога ні рабіў кепскаго жыдом. У той час, калі у Расіі чыніліся над жыдамі пагромы і страшэныя здзекі, беларускія селяне ні паддаваліся цёмнай агітацыі. Хлебаробы пашыя ні маглі рабіць кепскіх учынкаў над жыдамі, чуючы інстынктыўна у душы штучнасьць і ніпраўдзівасьць чорнасоценых ідэй. Так выходзіло, што вялікія грошы, высыпаныя дзеля пагромнай агітацыі расійскімі ісьціна-рускімі урадамі. падобна Сталыпінскому, у нашым краю,—пайшлі на нішто.

Нідармо у восені 1917 г. на Усебеларускім зьездзі у Менску прэдстаўнікі розных жыдоўссіх партый, вітаючы беларусаў, са шчырай ўздзячнасьцю ўспаміналі аб тым; што на Беларусі ніколі жыдоўскіх пагромаў ні было.

З. Бядуля.

(Далей будзе).

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Політэхнікум. Для адчыняемаго у Менску політэхнічнаго інстытуту памешканне знойдзено па Захароускай вул., д Мунвеза, № 144. Запісь вучняу пасьпешна прадаужаецца.

Да прыезду р. к. епіскопа. На адбыушемся 15 жніуня у дваранскім доме у чэсьць зноу назначанаго р.-к. епіскопа Лозінскаго абедзі па падпісцы (па 40 р. с пэрсоны) было 150 асоб. Вітальныя прамовы казалі замясьціцель кс. о. Рурк, старшыня польскай рэды Менскай зямлі Кенезіч, меськ. галава С. Хржонстоускі, беларус Пупка і др. У прамове Пупкі, казанай на беларускай мове з асобым пад'емам, былі адмечаны пакуты беларускаго народу у часе вайны, каторы без розніцы палітычных паглядау бачыць у прыбыушым епіскопе, як урожэнца Менскай губ., шчыраго абараніцеля і друга. У трох адказных прамовах еп. Лазінскі дзякуе сабраушыхся за пашану і унімание.

Уладжэнне капітула (духоунай каллегіі з 8—12 асоб) пры епіскопе Лозінскім, як ен кажа, пакуль адкладываецца дзеля браку спэцыяльных крэдытау.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаг[о] камандавання за 16 жніуня. 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Перэдавыя стычкі у раёні Кеммеля і пры Вье-Ба[...] кэн К поўдню ад рэкі Лі, каля Айэт і к поўначы ад [...] Анкр болей сільныя варожыя атакі былі адбіты.

Група арміі Бэна.

Ажыўлёная перастрэлка захадней Руа і паўднёва-з[а]хадней Нуайона, пасьля каторай пачаліся варожыя ата[кі] па абедзьвум старанам р. Аўры па напрамку па Ласіпні [і] на узвышках к заходу ад Уазы. Да поўдня ад Тыеску [...] двор Атэш астауся у варожых руках. Аднак мы адбілі я[...] атакі часьцю перад нашымі пазыцыямі, часьць--контр-атака[мі]. У бітвах каля Ласіпні вораг папярпеў цяжкі урон; тут [...] безрэзультатна атакаваў да 6 разоў і быў адцісцуты пас[ьля] дзесяцігадзіннай упартай бітвы у сваі ісходныя пазыц[ыі].

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

У распалажэнні р. Вэль вечарам агневая дзеяльнасьць усілілася і аставалася ажыўлёнай у працяг ночы.

Учора мы зьбілі 24 варожыя апараты. Лейтэнант Уд[э]меў сваі 54 і 55 перамогу, обэрлейтэнанты Кепнеке і Л[ёвен]цэр мелі сваі 30 перамогі, лейтэнант Некель сваі 22 і [...] лейтэнант Рэт сваю 21 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

Зыскі земработнікау. Шмат кім з б. служачых У. З. С. узбуджаны судзебныя зыскі за ніплацеж па абавязковым паперам (об'язательствам), выданым камітэтам зах. фронту у абязпечэнне уплаты пэнсіі і ліквідацыйных перад акупацыяй. Сумма зыскау даходзіць да 3.000.000 руб.

У губ. казначэйстві. 16 жніуня пачалася выдача пасобій пэнсыянэрам па сьпіску на 90 чалавек, пацьверджанаму нямецкімі уласьцямі. Размер пасобій ад 5-ці да 100 руб.

Одпуск прадуктау па бонам за першую палавіну жніуня адбудзецца у канцы бягучаго тыдня.

У 1-м пазычковым зьберагацельным таварыстве перэпрацоука устава (паміж іншым павялічэнне пастаноуленай нормы пазычак ад 500 да 1000 руб.) канчаецца у хуткім часе, пасьля чаго устау будзе прэдстаулены на пацьвярджэнне акружнога суда.

Добрыя ігльыкі адпускаюцца па 1 р. 30 к. дзесятак у бонавай краме 1-го пазычкавозьберагацельнаго таварыства.

С прычын Спаса (Прэабр. Госп.) заутра, 19 жніуня, праваслауныя служачыя установау ад працы асвабаджаюцца.

Аб самачынным захваці палеу Івенецкаго жанацкаго манастыра католікамі паступілі весткі у консысторыю. Справе дадуць належачы ход.

У Юбілейным Доме ад учэрайшаго дня пачау працаваць Бел. Нар. Сэкрэтарыят ад 10 да 3 гадзіны дня.

«Вольная Беларусь» № [...] Тыднеvік выйшоу з друку [...] жніуня. Змест: Што трэба даць кожнаму беларусу? [...] Ластоускаго. Апаведанне [...] назвы,—Я. Льосіка, У ляс[...] гушчары. Казка 1 акці—Ф[...] цішка Алехновіча, Мале[...] фэльетон—Антося Галіны.

Беларускі Народны Т[э...]

Сягодня, 18 жніуня, у [...]ларускай Хаце» спэктакль [...] Тэатру. Іграць будуць пе[...] раз у Менску фантаст[...] абраз п. з. «Кветка пап[...]ці». Гэтая поуная нас[...] пьеса летась на віленскай [...] не мела вялікі усьпех і м[...] разоу ігралась пад кіру[...] Ф. Алехновіча, каторы [...] часна ігрэе у ей ролю [...] пушчы. Сюжэтом для п[...] паслужыла вядомая нар[...] беларуская легенда аб [...] вітаючым у Купальскую [...] усемагутным цветку папа[...] Усцэнізована паводле [...] Янкі Купалы і К. Буйл[...] ленской пісьменіцай п. С[...] п. Алехновічам.

Спэктакль дапоуніць [...]лая камэдыя у 1 акце Ч[...] п. з. «Мядзьведзь».

Пасьля спэктаклю тан[...] 2 гадз. у начы. Буфэт. [...] Лато ды інш. забавы.

Цана білетау ад 2 р. [...]

Пачатак спэктаклю а $8^1/_2$ у веч.

Сягодня 18 жніуня Бе[...]кім Дабрачынным злуч[...] «Цетка»—памяці пісьме[...] Пашкевічовай — Кепры[...] робіцца скорбоначны з[...] карысьць Беларускай п[...]най дзіцячай калеіі.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво «Т-во Заран[...]»

Друкарня Я. А. Грынблята.